# Анатоль ЯРМОЛЕНКА: «Шчаслівы той, у каго ёсць сям'я і Радзіма»



## Народнаму артысту Беларусі, нязменнаму кіраўніку легендарных «Сяброў» – 75! З іх 55 ён на прафесійнай сцэне

**Кожная сустрэча з Анатолем Іванавічам – гэта падзея, адкрыццё. Здаецца, даўным-даўно знаёмы, звяртаемся адзін да аднаго на ты, шмат перагаворана за многія гады, і ўсё роўна штораз выяўляю ў сваім візаві нешта новае, адметнае. Ён не перастае здзіўляць – як Чалавек, які бясконца адданы Беларусі, як творца, чыё жыццё з'яўляецца зайздросным прыкладам вернасці песні і творчага даўгалецця.**

**– Анатоль, 75 і 55 – вось такія прыгожыя лічбы з'явіліся ў тваім жыцці. Як яны ўплываюць на сённяшні настрой і светаадчуванне?**

– Не магу сказаць, што заўладалі мною ці я неяк па-асабліваму іх успрымаю. Хутчэй за ўсё не пераймаюся гэтым, бо зусім іншае на сэрцы, у думках. Якраз на гэтым тыдні (размова адбылася напрыканцы кастрычніка. – *Аўт.*) роўна год, як Раіса Іванаўна пайшла з жыцця. Дагэтуль складана выйсці з жалобы, з гэтага стану, калі разумееш, што страціў палову сябе і нічога ўжо не паробіш, не вернеш. Накрывае часам так, што… Пяцьдзясят адзін год пражылі разам, гэта было каханне, пра якое раманы пішуць, – сапраўднае! Выхоўвала нашых дзяцей, мела непасрэднае дачыненне да працы нашай, да калектыву – многа ўсяго тут пераплецена, знітавана.

Калі нейкія суровыя выпрабаванні ў жыцці трапляюцца (лепей, вядома, каб іх не было), яны высвечваюць характары людзей, што ў іх закладзена. І тое, што я ўбачыў у сваіх дзецях, мне вельмі спадабалася. Ім самім складана, але зразумелі: цяжэй мне. Яны ўважліва, клапатліва да мяне ставяцца, падтрымліваюць. Адчуў, што яны сапраўдныя людзі, добра выхаваныя, у чым немалая заслуга Раі. Мы неяк яшчэ больш згуртаваліся і даражым адно адным.

Ёсць праца, у якой заўсёды знаходжу аддушыну. І калі мяне запрасілі ў Маскву на тэлевізійныя здымкі (шоу «Дзве зоркі. Бацькі і дзеці», у якім А. Ярмоленка запомніўся ў вобразе рэпера. – *Аўт.*), доўга думаў і сумняваўся, ехаць ці не. Рая яшчэ была жывая, яна

сказала: «Гэта твая праца, сэнс справы, на якую ты паклаў сваё жыццё». Так вось і атрымалася, што з яе благаслАвення паехалі, дастойна з Алесяй выступілі. Шматлікія гледачы не толькі з Беларусі, а з усіх канцоў свету пісалі ўзрушаныя і ўдзячныя водгукі.

**– Напэўна, фантастычная лічба атрымаецца, калі падлічыць, колькі разоў выходзіў на сцэну і песень праспяваў за 55 гадоў творчай дзейнасці?**

– Не падсумоўваў, але думаю, што так. Апроч кавідных гадоў, калі «Сябры» сядзелі ў творчай ізаляцыі, мноства было розных канцэртаў, дабрачынных у тым ліку. Ніколі не адмаўляўся, бо лічу: гэта мой творчы абавязак перад людзьмі, якім патрэбны нашы песні. Урэшце, гэта справа майго жыцця і было б дзіўна не цаніць тыя магчымасці, якія яно дае артысту. Мог бы, канешне, ужо адпачываць на лаўрах, як гаворыцца, але гэта не той выпадак дакладна. І дзеці разумеюць, што значыць для мяне мая праца, магчымасць выказацца сваёй творчасцю.

*«Тое, што я ўбачыў у сваіх дзецях, мне вельмі спадабалася. Ім самім складана, але зразумелі: цяжэй мне».*



З жонкай Раісай Іванаўнай. Адзін з апошніх здымкаў

Апошнім часам атрымліваю шмат лістоў (можа, як ніколі раней!) на электронную пошту, у сацсетках пішуць – з Расіі, Украіны і з Беларусі, вядома. Некаторыя пасланні вельмі шчымлівыя, іх цяжка чытаць – столькі сканцэнтравана тут болю, неўразумення і веры, надзеі адначасова. Ведаеш, і ў расійскага афіцэра на перадавой, і ў кіяўлян, што ратуюць свае жыцці ў бамбасховішчы, і ў жанчыны, якая жыве ў мірным Гомелі, часта адны і тыя ж думкі, развАжанні. Пішуць, што мы з вашымі песнямі раслі, будавалі сваё жыццё, сябравалі, збіраліся разам за святочным сталом. Кожны пайшоў сваім шляхам, але захавалі гэтае сяброўства, традыцыі. І раптам усё абрынулася, сталі ворагамі адно аднаму. Як? Чаму? Гэта невыносны душэўны цяжар, які цябе разрывае літаральна на часткі. У новай песні, якая так і называецца – «Боль», я пастараўся неяк перадаць сваё разуменне, душэўны стан.

Мы даўно разабраліся б, знайшлі выйсце з гэтай сітуацыі, калі б не было зацікаўленасці трэцяга боку. Гэта як у сям'і. Пажаніліся людзі і жывуць у згодзе, часам сварацца, але трымаюцца разам, умацоўваючы свой саюз. Але як толькі нехта, цешча там ці свякруха, пачынае ўлазіць у сямейныя справы і даваць парады – чакай бяды: узнікаюць канфлікты, высвятленне адносін і да разводу даходзіць.

Жыццё рана ці позна ўсё расставіць па сваіх месцах. Яно мудрэйшае, чым нашы самыя разумныя меркаванні. Трэба жыць, трэба працаваць, рабіць сваю справу, не дурыць самому сабе галавы. Сёння інтэрнэт унёс столькі праблем! Людзі там спадзяюцца знайсці праўду, а рознага кшталту недавучаныя блогеры, якія некалі чыталі толькі газетныя загалоўкі, цяпер дураць галаву карыстальнікам, а тыя праз эмоцыі вядуцца на гэта. Ідзе сапраўдная інфармацыйная вайна. З так званых укідаў усё ж і пачынаецца. Таму трэба мець галаву на плячах. І радавацца жыццю.

Сёння цікавяцца многія, ці будзе юбілейны канцэрт. Улічваючы тое, што сказаў раней, цяпер не, кры-

ху пазней. Працую ўжо над новай праграмай. Магчыма, яна будзе называцца «Трэцяя чвэрць». Ведаеш, жыццё – гэта заўсёдная школа і таму такія асацыяцыі са школьнымі гадамі з'явіліся. А чацвёртая чвэрць павінна стаць вельмі мудрай, каб перадаць вопыт і гонар за тое жыццё, што падараваў мне лёс.

**– Ужо каторы год ты працуеш над кнігай мемуараў. Мне здаецца, юбілейны год – добрая падстава прэзентаваць яе публіцы.**

– Кніжка даўно гатова, але за апошні час столькі адбылося ўсяго, што варта асэнсаваць, абдумаць… Мяркую, дзеці ўжо яе дапішуць. Не буду загадваць, як яно будзе. Адзінае, што хацеў бы, каб маё пакаленне ў гэтай кнізе ўбачыла сябе, пазнала свае думкі і перажыванні, згадала пра падзеі, якія паўплывалі на яго лёс. Зрэшты, кніжкі ўсё роўна ніхто сёння не чытае – гугл усё ведае. *(Усміхаецца.)*

**– Не магу падзяліць твой песімізм наконт чытання… Пра які перыяд жыцця найцяжэй было згадваць у мемуарах?**

– Скажу так: я ніколі не затлумляўся, а імкнуўся і дасягаў. Былі, вядома, падзеі, якія чорнымі штрыхамі прайшліся па жыцці. Чарнобыль было складана перажыць. Афганістан… Быў з канцэртамі там, ёсць нават узнагарода – імянны гадзіннік ад савецкага камандавання. Там упершыню адчуў і зразумеў, што такое вайна. Час падзяліўся на да і пасля. Вечарам сядзім з байцамі, выпіваем па сто грамаў франтавых, як кажуць, і яны ідуць. На вайну. А наступным днём на стале некалькі пустых чарак з лустачкамі хлеба зверху – нехта з хлопцаў не вярнуўся. Толькі ўчора з імі размаўлялі, згадвалі нешта, смяяліся… Вайна – гэта жахліва. Не дай Бог, каб яна была на нашай зямлі. Трэба трымацца, трымацца і трымацца!

**– Нягледзячы на ўсе гучныя тытулы і прызнанне, спакусы рознага кшталту, ты здолеў не захварэць на зорную хваробу. Прынцыпова не паддаваўся ці само жыццё ўсё неяк так уладкавала?**

– Гэта мой характар. І дзяцей вучу: усё праходзіць, слава таксама нявечная. Калі толькі пра яе думаць, не заўважыш, як яна знікне. Рабі сваю справу, а слава і папулярнасць, калі варты таго, знойдуць цябе самі. Не люблю людзей, якія дасягнулі першага поспеху і лічаць, што схапілі Бога за бараду. Увогуле заўсёды раю артыстам выходзіць з вобразу, быць нармальнымі людзьмі, а не ўяўляць сябе ледзь не валадарамі чалавецтва. Выйшаў на сцэну, праспяваў – і заставайся чалавекам.

Я заўжды стараўся быць сваім для людзей, якія прыходзяць на канцэрты. Высока цаню іх увагу да сваёй творчасці. Таму, як толькі ўбачу, што нехта з

**Сёлета Анатоль Ярмоленка ўганараваны спецыяльнай узнагародай Прэзідэнта Беларусі «Праз мастацтва – да міру і ўзаемаразумення», а на Алеі зорак ля амфітэатра ў Віцебску з'явілася імянная зорка народнага артыста і яго «Сяброў»**



гледачоў пакідае залу, калі выйду на сцэну, адразу закіну гэту прафесію. Мне ёсць чым займацца. Увогуле, калі мне было дваццаць тры гады, думаў, што да 27 буду спяваць. *(Усміхаецца.)* Потым да пяцідзесяці, планку падымаў і падымаў, а цяпер вырашыў: пакуль патрэбны людзям, буду на сцэне.

*«Трэба жыць, трэба працаваць, рабіць сваю справу, не дурыць самому сабе галавы».*

**– А самае першае сваё з'яўленне як артыста памятаеш? Можа, нават не на сцэне перад гледачамі, а, магчыма, так, як у маім дзяцінстве: ставяць цябе на табурэтку перад гасцямі і забаўляеш іх вершыкам ці песняй.**

– Ну, так-так. Як жа без гэтага: табурэтка, госці і спяваеш! Затым школьная самадзейнасць, удзельнічаў у розных конкурсах, першыя месцы займаў. Служба ў арміі, а служыць давялося ў Баку, стала вырашальнай у маім творчым лёсе. У Азербайджане пазнаёміўся з Муслімам Магамаевым і Паладам Бюль-Бюль Аглы, дзякуючы якім усе сумненні наконт вялікай сцэны адпалі. Я літаральна загарэўся гэтай марай.

**– У адным з інтэрв'ю ты неяк прызнаўся, што ўсе песні, якія выконваеш, для цябе, як дзеткі. І ўсё ж ці ёсць у рэпертуары «Сяброў» асабліва значная кампазіцыя, тая, дзе лірычны герой найбольш адпавядае ўласнаму светапогляду і характару? Дзе ён такі, як і ты, – сапраўдны.**

– Насамрэч у кожнай песні ёсць нейкая мая рыса, мае адчуванне і разуменне рэчаіснасці, успрыманне сябе ў ёй. Памятаеш, была такая кампазіцыя «Устал»? Яна была напісана «пад каранавірус», які перавярнуў наша жыццё і прымусіў паглядзець на яго іншымі вачыма. І я тут не выключэнне.

Я не спяваю тое, што мне незразумела, што не адчуваю. Так і павінна быць, лічу. Глядач адразу адчуе фальш, яго не падманеш і ніяк не прымусіш любіць тое, што не любіш сам.

**– Сталым людзям уласціва філасофстваваць, бурчэць, павучаць іншых...**

– Гэта каменьчык у мой гародчык? Я і малады быў такі: засяроджаны, бясконца нешта перапытваў, павучаў. У трэндзе сённяшніх абставін разумею, што



**У Анатоля Ярмоленкі трое ўнукаў. На здымку: з малодшым Макарам. 2018 год**

нічога сваім бурчаннем не дасі, не даб'ешся. Хіба што адвергнуць цябе і згубіш кантакт з людзьмі маладымі, якія найперш не прымаюць такога стылю ў зносінах.

Мне тут дзеці, потым унукі шмат у чым дапамаглі – у маім жыцці і стаўленні да людзей. Магу быць дастаткова жорсткім, калі трэба прыняць нейкае рашэнне ў калектыве, але не люблю безапеляцыйнага ментарства. Гэта адштурхоўвае.

*«Вайна – гэта жахліва. Не дай Бог, каб яна была на нашай зямлі. Трэба трымацца, трымацца і трымацца!».*

У нашай сям'і, калі збіраюцца прадстаўнікі розных пакаленняў нешта абмеркаваць альбо параіцца, ніколі не навязваю сваю думку, а прапаную разважаць разам. І рашэнне звычайна прымальнае для ўсіх у выніку.

**– Ярмоленка-бацька і Ярмоленка-дзядуля – гэта два розныя чалавекі?**

– Абсалютна. Дзяцей нашых у асноўным глядзелі мая і жончына маці. А мы больш займаліся сабой – шмат працавалі, каб рэалізаваць усе свае творчыя памкненні. Сёння, калі нечага ўжо дасягнулі, сам унукаў гляджу і, вядома ж, больш увагі і клопату праяўляю, чым у свой час да дзяцей, люблю папесціць.

У мяне іх трое – Ульяна, Макар і Анатоль-малодшы, выканаўца, якога гледачы добра ведаюць. Ды што там казаць, хутка-хутка стану прадзедам. *(Усміхаецца.)*

***«Планку падымаў і падымаў, а цяпер вырашыў: пакуль патрэбны людзям, буду на сцэне».***

Унукі мае малайцы, увесь гэты складаны год былі са мной побач, падстаўлялі плячо. Сказалі: «Дзед, мы цябе не кінем». І гэта не тое што вельмі шчымліва прагучала і прабівала нават на слязу. Гэта правільна, так павінна быць у людзей. Я люблю, калі ў жыцці ўсё правільна.

**– Юбілейныя даты якраз прыпалі на Год гістарычнай памяці. І, відаць, трэба сказаць яму дзякуй, бо цяпер мы яшчэ больш усведамляем, як важна даражыць гісторыяй роднай краіны, не дазваляць калупацца ў ёй чужынцам, ведаць і шанаваць свае вытокі, з якіх, уласна, усё пачынаецца…**

– Так, безумоўна. Ведаеш, з самага пачатку мы стваралі гісторыю сваёй сям'і. Спачатку была ў нас васьміміліметровая камера. Я і мой брат, нябожчык, здымалі на яе ўсё самае важнае і цікавае. Калі збіраліся ўсе разам, уключалі запіс, праглядалі, абмяркоўвалі, жартавалі. Дзеці таксама сядзелі, глядзелі. І сёння стараюся знайсці зручны момант, каб расказаць унукам пра нашых продкаў. Яны і самі цікавяцца. Часта просяць прыгадаць прадзеда Івана, як ён ваяваў, біў фашыстаў. І ўвогуле, усё, што датычыць нашага радаводу, ім неабыякава.

Мяне такое стаўленне, натуральна, надзвычай цешыць. А з іншага боку, так і павінна быць, не іначай. Гісторыю сваёй краіны найперш пазнаеш праз лёсы і жыццё родных людзей розных пакаленняў, праз малую радзіму. Гэта самае правільнае, што можа быць. Нашы продкі жылі і стваралі дзеля нас, каб мы не спазналі таго, што выпала на іх нялёгкую долю. Трэба заўсёды памятаць пра гэта, рабіць высновы. Бо па-сапраўднаму шчаслівы той чалавек, у каго ёсць сям'я і Радзіма. Пра гэта і адна з нашых апошніх кампазіцый «Боль зямлі», якую «Сябры» спявалі 17 верасня на патрыятычным форуме ў гонар Дня народнага адзінства ў «Мінск-Арэне». Дагэтуль памятаю незвычайна хвалюючую атмасферу, што панавала там. І той фантастычны момант узрушанасці, калі велізарная зала ў адзіным парыве падхапілася і стоячы слухала нашу песню.



**У рэдкія хвіліны адпачынку**

***«У трэндзе сённяшніх абставін разумею, што нічога сваім бурчаннем не дасі, не даб'ешся».***

**– Дзякуй, Анатоль, за цікавую размову. «Беларуская думка» з прыемнасцю далучаецца да шматлікіх юбілейных віншаванняў і зычыць моцнага здароўя, даўгалецця і нястомнай творчай энергіі!**

– Дзякуй. Жадаю шчасця чытачам і аўтарам вашага часопіса, рэдакцыйнаму калектыву. Давайце думаць пазітыўна, светла – тады ўсё ў нас будзе добра!

*Гутарыў Ігар ГАНЧАРУК*

*Фота з асабістага архіва Анатоля Ярмоленкі*